кальной культуры (наряду с народной, духовной, академической), как одного из ведущих направлений в современной культуре. Содержание концепции связано с характером и функциями современной музыкальной культуры в процессе формирования у белорусской молодежной аудитории духовного потенциала, нравственных и эстетических ценностей и т. п.

Возможные области использования результатов исследования связаны с широким спектром наук гуманитарного профиля – искусствоведением, культурологией, социологией, эстетикой музыки, педагогикой.


1. Климук, И. Я. Мода. Музыка. Молодежь. Опыт социокультурного и педагогического исследования : монография / И. Я. Климук. – К. : Освіта України, 2010. – 238 с.

2. Чередниченко, Т. В. Современная марксистско-ленинская эстетика музыкального искусства : проблемы и перспективы развития / Т. В. Чередниченко. – М. : Сов. композитор, 1988. – 318 с.



***У. Ф. Красюк,***
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*


## КРОС-КУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ І ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ – ПЫТАННІ СУЧАСНІКАМ

Дамінуючым фактарам развіцця сучаснай цывілізацыі з’яўляецца глабалізацыя. Яна ўсё больш размывае нацыянальна-дзяржаўныя межы палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, інфармацыйнымі і іншымі сувязямі. Глабалізацыя актывізуе крос-культурныя працэсы, стымулюе культурную дыфузію, стварае феномен мультыкультуралізму. Праявай глабалізму ў культуратворчых працэсах выступае ўніфікацыя падыходаў да вызначэння функцый культуры, напрамкаў яе развіцця, вынікам чаго з’яўляецца стандартызацыя густу спажывальнікаў «масавай культуры». У той жа час гэтыя працэсы накладаюцца на супрацiўленне нацыянальна-дзяржаўных супольнасцей захаваць і развіць сваю ідэнтычнасць. Як паказвае практыка сённяшняга жыцця цывілізацыйныя адрозненні не толькі не скарачаюцца, але і паглыбляюцца. Паэтычная рэпліка Кіплінга трансфармавалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў бездакорную тэорыю Хантынгтона і знайшла працяг у поглядах і практыцы еўрапацэнтрызму, ісламскага фундаменталізму, ідэолагаў Паднябеснай і г. д. Пры як быццам наяўнасці культурнага шматгалосся і плюралізму – атрыбутаў «адкрытага грамадства» – развіццё культуры не пушчана на самацёк. Гэта і зразумела, яна функцыянуе ў непарушнай сувязі з усімі другімі напрамкамі развіцця соцыуму, асаблівасцямі яго будовы і структуры.

Праблема глабалізацыі і развіцця культуры ў сучасных умовах павінна разглядацца як узаемасувязь сацыяльных практык і сацыяльных тэхналогій. Гэта азначае, што грамадства павінна мэтазгодна і свядома, абапіраючыся на навуку, асэнсоўваць і вызначаць параметры свайго развіцця. У іншым выпадку магчымасцей і надзей на стабільны накірунак руху наперад будзе няшмат. Сацыяльныя тэхналогіі – гэта прыёмы дзейнасці інстытутаў грамадства, пачынаючы ад дзейнасці дзяржаўных устаноў і канчаючы СМІ і сацыяльнымі сеткамі. Сутыкненне палітычных тэхналогій ў рэчышчы глабалізацыйных працэсаў з культуратворчымі працэсамі патрабуе пільнасці і ўвагі, крытычнага падыходу. Менавіта тут безадказныя валюнтарысцкія рашэнні і актывы ў спалучэнні з нізкай палітычнай свядомасцю і культурай «мас» могуць прывесці да непрадказальных, па свайму зместу дэструктыўных наступстваў. Таму сацыяльныя тэхналогіі, палітычныя практыкі і развіццё культуры неабходна спалучыць, як гэта ні банальна, з навуковымі даследаваннямі. Спашлёмся на гістарычны вопыт – усюды, дзе арганізацыйна-ўпраўленчыя методыкі былі заснаваны на дакладных, прапрацаваных праграмах, на арганізацыі сацыяльнага канструявання на падставе сацыяльных ведаў, каштоўнасцей культуры, нацыянальных традыцый, вынікі былі станоўчыя. Прыклад – сённяшні Кітай. І наадварот: сацыяльнае «праектанства» і «пражэкцёрства», а то і наогул прадузяты суб'ектывізм, без апоры на навуковы падыход і аксіялагічныя арыентацыі з пагардай да культурных набыткаў прыводзілі да адмоўных, парою трагічных вынікаў.

Культура мінулых стагоддзяў мела тую акалічнасць, што адзначалася дакладнай устойлівасцю і цэласнасцю, бо адпавядала асноўным характарыстыкам прыдатнай ёй цывілізацыі. Гістарычны шлях таго ці іншага народа, прыродныя ўмовы існавання, сацыяльны строй, больш-меньш устойлівыя магчымасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суіснавання з другімі этнасамі, з аднаго боку, надавалі ўстойлівасць культурным патэрнам, а з другога – спрыялі крэатыўнасці найбольш актыўнай часткі народа. Напрацаваныя багацці матэрыяльнай і духоўнай культуры напластоўваліся ў адпаведны капітал, з якога вылучалася высокая культура. Яна была схільна і да флуктуацый, бо мяняліся гістарычныя ўмовы яе існавання, палітычныя і сацыяльныя абставіны. У глыбінях народнага жыцця сталела традыцыйная культура як сукупнасць шматвяковага вопыту. Традыцыя – гэта не толькі застылая форма жыццядзейнасці, яна выступае і ў якасці рухавіка гістарычнага развіцця. Так, гісторыя беларускага народа сведчыць, што менавіта ўстойлівасць традыцыйнай культуры дазволіла вытрымаць нялёгкія выпрабаванні цяжкага гістарычнага шляху, перажыць навалу розных чужынцаў, пераадолець хвалі паланізацыі, русіфікацыі, касмапалітызму мас-культуры, прадухіліць размыванне этнічнай тоеснасці і захаваць пачуццё нацыянальнай годнасці. Таму актуальным з'яўляецца неўміручы заклік Францішка Багушэвіча не кідаць роднай мовы, берагчы роднае слова, бо слова – сарцавіна культуры.

Сёння культурная традыцыя вытрымоўвае чарговае выпрабаванне, змест якога – «…панаванне чыстай, хаця знешне і замаскіраванай і адкрыта не прызнанай тэхнакратыі, перавага самага знешняга боку працэсу цывілізацыі над усёй сферай культуры ўнутры агульнай формы існавання», што раскрываецца «…у апусташальным уздзеянні тэхнічна абумоўленай, пранізваючай і разлагаючай свет дыскрэтнасці ўнутранага існавання» [1, с. 248]. Ніякія рэформы і мадэрнізацыя, інавацыйныя праекты і бясконцыя кадравыя ператрусы не дадуць станоўчага выніку, калі яны не будуць адпавядаць тым культурным традыцыям, што ўвайшлі ў плоць народа, не будуць чалавекаразмернымі і прымальнымі. Вопыт краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну гэта пацвярджае.

У век масавых камунікацый традыцыйная культура не можа не адчуваць уздзеяння тых навацый, што адбываюцца ў сучасным свеце, хаця гэтае ўздзеянне адбываецца па-рознаму. Калі ўзяць усё яшчэ дамінуючую лінію развіцця культуры сучаснай цывілізацыі – постмадэрн, то становіцца відавочным, што ў рэчышчы глабалізацыі яго ўплыў на нацыянальныя культуры, іх традыцыі, ідэнтычнасць не выклікае сумненняў. Постмадэрн задае тонус ментальнасці інтэлектуалаў, палітыкаў, эканамістаў, не гаворачы ўжо пра творчую эліту. Аднак сённяшняе яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становішча неадназначнае: постмадэрнізм «мадэрнізуецца», яго «класічныя» палажэнні пераглядаюцца і паступова адмаўляюцца, хаця адзінства, зразумела, не наглядаецца. Амбівалентны характар рэчаіснасці пачатку XXI ст. – нарошчванне матэрыяльнай тэхнасферы і сферы паслуг суправаджаецца віртуалізацыяй грамадскага жыцця, што накладае адбітак на ўсю сацыяльную і духоўную канву. У такіх варунках нацыянальныя культуры з іх ідэнтычнасцю, а таксама масавая культура з яе кітчам, стандартызаваны міжнародны этыкет і мода безумоўна адчуваюць уплыў той прызнанай элітамі светапогляднай дамінанты, што з'яўляецца пануючай і надае сэнс сучасным уяўленням аб іх. Таму набывае жыццёвую актуальнасць праблема пераемнасці нацыянальнай культуры, вызначэння яе аксіялагічнага статусу, захавання культурнай спадчыны.

Разгледзім праблему захавання архітэктурнай спадчыны. Многае ўжо страчана беспаваротна. На месцы былых шэдэўраў красуюцца сучасныя шкло – бетон. Гістарычныя руіны зараслі бур'янам – звыклая карціна. Цяпер шмат дзе ідзе праца па адраджэнні таго, што яшчэ можна выратаваць. Аднак пытанняў не паменшала. Як сумясціць аўтэнтыку і стылізацыю? Ці «паміраццa» гістарычнасць і камерцыйнасць? Хто ўстанаўлівае крытэрый навуковага падыходу да магчымасцей рэстаўрацыі? Наколькі постмадэрнісцкія сентэнцыі даюць магчымасці для архітэктурнай фантазіі пры наяўным недахопе гісторыка-дакументальных крыніц?

Зразумела, трэба выкарыстоўваць, як ў такіх выпадках кажуць, сусветны вопыт. Аднак гэты вопыт не зусім падкажа, што рабіць са значнай колькасцю сядзіб-маёнткаў, раскінутых па абшарах рэспублікі, што яшчэ ацалелі і якімі ніхто не хоча займацца. Некаторым пашанцавала: хоць і часам цьмянай канцэпцыяй адбудовы, тым не меньш палацава-паркавыя комплексы памалу адраджаюцца. Аднак тое, што ажыццяўляецца праграма рэстаўрацыі і рэканструкцыі гістарычных аб'ектаў, не павінна супакойваць. Нашы продкі аставілі нам вялікую спадчыну, і мы павінны цывілізавана ёю распарадзіцца, асабліва той, якой не нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэта сёння яна такога статусу не мае, а заўтра раптам выявіцца, што мы праглядзелі яе значымасць, тым больш што многія помнікі беларускай культуры і архітэктуры лёсам гісторыі засталіся па-за межамі нашай краіны і іх будучыня неадназначная. У самой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэспубліцы «складанымі застаюцца адносіны да архітэктурнай спадчыны, магчымасцей яе арганічнага суіснавання з сучаснымі будынкамі» [2, с. 6]. Сказанае два дзесяцігодзі назад застаецца актуальным і сёння.

Тэхнакратычны стыль мыслення, эканамічныя выгоды, віртуалізацыя светаадчування ва ўмовах глабалізацыйных і мультыкультуралісцкіх працэсаў не павінны адхінаць нас ад гістарычнай памяці, адчування нашага абавязку быць удзячнымі папярэднім пакаленням, іх вопыту і іх набыткам. Менталітэт беларускага народа не прымае неахайных адносін да даўніны, да памяці продкаў, ён заўсёды спачувальна і паважліва прыхільны да сваёй бацькаўшчыны.


1. *Вебер, А.* Избранное: Кризис европейской культуры / А. Вебер. – СПб. : Университетская книга, 1999. – 565 с.

2. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал.: Г. В. Марцэлесу (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 6 : 1960-я – сярэдзіна 1980-х гг. / рэд. В. І. Жук. – 1994. – 375 с. : іл.



***Д. А. Крывашэй,***
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*


## ДЗЯРЖАЎНАЯ КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ МЕХАНІЗМЫ РЭАЛІЗАЦЫІ (1991–2010)

Праблема вызначэння зместу культурнай палітыкі абумоўлена разнастайнасцю поглядаў. Мы можам акрэсліць асноўныя механізмы яе здзяйснення: адміністрацыйны (арганізацыйна-структурны), палітыка-прававы, фінансава-эканамічны, кадравы.

Адміністрацыйны механізм уключае ў сябе распрацаваную арганізацыйную структуру кіравання сферай культуры. Галоўным у ім з’яўляецца сістэма размеркавання паўнамоцтваў розных суб’ектаў. Дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў галіне культуры ў Рэспубліцы Беларусь здзяйсняецца ў межах цэнтралізаванай сістэмы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама іншымі дзяржаўнымі органамі ў межах іх кампетэнцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ